ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

САКАВІК

Віцебск 2013

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Сакавік

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : сакавік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. — Віцебск, 2013. — 30 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Сакавік

Інфармацыйнае паведамленне

2013

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатавай*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 сакавіка 2013 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Бешанковіцкай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Расонскай, Сенненскай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай раённых сетак бібліятэк, Віцебскай, Полацкай і Наваполацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

Маханькоў за плённае і яркае жыццё ў мастацтве. Нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За плодотворный труд, высокий профессионализм, значительный вклад в развитие национального театрального искусства и в связи с празднованием Международного дня театра» ўзнагароджана артыстка, вядучы майстар сцэны *Вольга Маханькова*. Артыст, вядучы майстар сцэны *Аляксей Макарскі* адзначаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Артыст вышэйшай катэгорыі *Яўген Гусеў* і *Вольга Лазебная*, вядучы майстар сцэны, атрымалі Падзяку Міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

http://lialka.by/rus/news/#news-108

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З **12** па **31 сакавіка** ў Талачынскім раённым Доме рамёстваў дзейнічала выстаўка работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Вясновы настрой».

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

24 сакавіка ў Лепельскім раённым Доме рамёстваў адкрылася выстаўка «Таленты зямлі нашай роднай», падрыхтаваная майстрамі і мастакамі народнага клуба «Скарбонка».

http://www.lepel-kraj.by/?p=3467#more-3467

У Глыбоцкім раённым Доме рамёстваў працавала выстаўка работ майстра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва *Марыны Жытко*.

g-gazeta.by/index.php/Культура/13-03-2013-1011.html

Выстаўка выцінанкі «Па сцяжынках народнага календара» майстра Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка *Алены Шушарт* прадстаўлена ў музеі-сядзібе І. Я. Рэпіна «Здраўнёва».

Полацкі веснік. – 2013. – 15 сак. – С. 2.

Сіманаў. Яны паказалі ў КЗ «Віцебск» спектакль «Лица», пастаўлены ў выглядзе мініяцюр па апавяданнях А. Чэхава «Психопаты», «Канитель», «Злоумышленник» і «Дипломат».

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 16 марта. – С. 4, 8.

9 сакавіка коласаўцы прапанавалі жыхарам Віцебска новы спектакль – камедыю «Што баліць?». Пастаноўка *Валерыя Анісенкі* па п'есе *Лявона Агулянскага* прапануе задумацца пра вернасць, каханне і чалавечую адзіноту.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 14 сак. – С. 22.

У сакавіку адбылася прэм'ера п'есы сучаснага драматурга, сцэнарыста і рэжысёра Томскага тэатра драмы *Мікалая Рудкоўскага* «Дожить до премьеры». Пастаноўка расказвае пра дзень сённяшні і нагадвае пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 12 сак. – С. 5.

Малады мінскі рэжысёр *Аляксандр Марчанка* паставіў на сцэне Коласаўскага тэатра спектакль пад назвай «Леанарда» па п'есе славенскага драматурга *Эвальда Флізара*. Дарэчы, гэтай пастаноўкай акцёры абнавілі новую пляцоўку тэатра – камерную сцэну пасля рэканструкцыі. Прэм'еру коласаўцы павязуць у г. Крань на Міжнародны фестываль славенскай драмы, які пройдзе 2–10 красавіка.

Витебский проспект. – 2013. – 21 марта. – С. 6.

27 сакавіка Беларускі тэатр «Лялька» запрасіў на прэм'еру. Мастацкі кіраўнік тэатра *Віктар Клімчук* у сваёй пастаноўцы «Тук-тук! Хто там?» прадставіў новае бачанне вядомай усім казкі «Воўк і сямёра казлянят». Сцэнаграфію спектакля зрабіў *Аляксандр Сідараў*, лялькі і касцюмы – *Ганна Сідарава*, музыку напісала *Алена Яўневіч*, над харэаграфіяй працавала *Дзіяна Юрчанка*, над тэкстамі песень і перакладам інсцэніроўкі – *Людміла Сіманёнак*.

Напярэдадні Міжнароднага дня тэатра ў тэатр прыйшло некалькі прыемных навін. Узнагароду ГА «Беларускі саюз тэатральных дзеячаў» «Хрустальны анёлак» атрымаў артыст, вядучы майстар сцэны *Алесь*

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Дыпломам удзельніцы рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года-2012» у намінацыі «За ўклад у духоўна-маральнае адраджэнне» ўзнагароджана дырэктар Язненскага СДК *Ларыса Генадзьеўна Бервячонак*. Урачыстая цырымонія адбылася **15 сакавіка** ў сталічным спартыўна-забаўляльным комплексе «Мінск-Арэна».

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

19 сакавіка ў г. Докшыцы адбылася выязная калегія ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама з удзелам начальніка ўпраўлення Л. К. Аленскай, кіраўнікоў і спецыялістаў Віцебскага, Магілёўскага, Смаленскага абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці, начальнікаў аддзелаў культуры райвыканкамаў вобласці, дырэктараў раённых метадычных цэнтраў, пераможцаў абласнога агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку работы сельскіх устаноў культуры і абласнога агляду-конкурсу творчых калектываў сельскіх устаноў культуры клубнага тыпу і дзіцячых школ мастацтваў. У праграме калегіі: канферэнцыя «Асаблівасці. Здабыткі. Вынікі працы сельскіх устаноў культуры», выстаўка Дамоў рамёстваў у рамках абласнога агляду-конкурсу па развіцці традыцыйнага ткацтва, узнагароджанне і канцэрт пераможцаў.

Па выніках абласнога агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку работы сельскіх устаноў культуры пераможцамі прызнаны:

– у намінацыі «Лепшая комплексная работа ўсіх устаноў культуры ў дадзеным сельскім населеным пункце» – 1-е месца – работа ўстаноў культуры *в. Язна Міёрскага раёна*; 2-е месца – работа ўстаноў

культуры *в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна*;

– у намінацыі «Лепшая сельская ўстанова клубнага тыпу» – *Калінаўскі сельскі Дом культуры Дубровенскага раёна*;

– у намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка» – *Іёдская сельская бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС*;

– у намінацыі «Лепшая сельская дзіцячая школа мастацтваў (філіял, клас), музычная школа» – *Навасёлкаўская ДШМ Пастаўскага раёна*;

– у намінацыі «Лепшы новы тып арганізацыі культуры на сяле» – *Бароўскі Цэнтр культуры і вольнага часу Лепельскага раёна*;

– у намінацыі «Лепшы Дом культуры (клуб) аграгарадка» – 1-е месца – *Дабрамыслянскі сельскі Дом культуры Лёзненскага раёна*; 2-е месца – *Сільніцкі сельскі Дом культуры Полацкага раёна*;

– у намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка аграгарадка» – *Лаўжанская сельская бібліятэка Шумілінскай ЦБС*;

– у намінацыі «Лепшае культурна-дасугавае абслугоўванне насельніцтва малых і аддаленых вёсак сельскай установай культуры» – *Параф'янаўскі сельскі Дом культуры Докшыцкага раёна*;

– у намінацыі «Лепшая сельская філарманічная (тэатральная) пляцоўка» – *Варапаеўскі Дом культуры Пастаўскага раёна*;

– у намінацыі «Лепшая канцэртная праграма абласнога агляду-конкурсу творчых калектываў сельскіх устаноў культуры клубнага тыпу і дзіцячых школ мастацтваў» – *Докшыцкі раён*;

– у намінацыі «Лепшая рэжысёрская пастаноўка праграмы выступленняў творчых калектываў сярод раёнаў вобласці» – *Шаркаўшчынскі раён*.

Віцебскі АМЦНТ

Цырымонія ўручэння абласной літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі за 2012 год прайшла **21 сакавіка** ў гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя Максіма Горкага. У намінацыі «Проза (у тым ліку публіцыстыка і драматургія)» прэмія была ўручана *Палачаніну Фёдару*

культуры Беларусі, праходзіла на агароджы батанічнага саду (скрыжаванне вуліц Камуністычнай і Урыцкага).

http://news.vitebsk.cc/2013/03/23/zabor-edze-w-vitsebsk/

МУЗЫКА

2 сакавіка на «Звёздном ринге» тэлеканала СТВ сышліся фіналісты праекта «Поющие города». Таленавітыя глыбачанкі *Жанна Нарыцына* і *Тацяна Кітова* спаборнічалі з творчым дуэтам з Пінска «Маша і Гоша». Дзяўчаты атрымалі перамогу, абышлі сапернікаў больш чым на тысячу галасоў, іх падтрымалі 4611 тэлегледачоў.

Народнае слова. – 2013. – 5 сак. – С. 5.

10 сакавіка ў абласной філармоніі адбыўся канцэрт эстрадна-сімфанічнага аркестра Гомельскай абласной філармоніі (мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр *С. Шныр*) з праграмай «Я не люблю, когда наполовину…», прысвечаны 75-годдзю У. Высоцкага.

У рамках цыкла «Музычныя вечары Латвіі ў філармоні і "Sveika, Mūzika!"» **14 сакавіка** адбыўся канцэрт арганнай музыкі лаўрэата міжнародных конкурсаў *Ліенэ Андрэты Калнцыема*.

16 сакавіка ў КЗ «Віцебск» прайшло выступленне народнага камернага хору Цэнтра культуры «Віцебск» з праграмай «Возвышенное и земное» (кіраўнік *Т. Жукава*). У праграме духоўныя спевы, класічныя кампазіцыі, народныя песні і інш.

http://www.gck.by/2013/03/возвышенное-и-земное

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

У КЗ «Віцебск» у **сакавіку** адбылася антрэпрыза (спектакль «Валенок» па п'есе *Міро Гаўрана* ў пастаноўцы *Уладзіміра Усцюгова)* з удзелам зорак расійскай сцэны *Тацяны Васільевай*, *Станіслава Садальскага*, *Вольгі Тумайкінай*.

Сакавіцкая афіша парадавала віцебскіх «тэатраманаў»: гасцямі горада сталі народныя артысты Расіі *Аляксандр Калягін* і *Уладзімір*

мастакоў *А. А. Салаўёва* «Тэатр Аляксандра Салаўёва». На выстаўцы прадстаўлены эскізы тэатральных касцюмаў і дэкарацый, тэатральныя афішы, створаныя мастаком за перыяд творчай дзейнасці ў тэатры.

http://vokm.museum.by/be/node/33440

У культурна-мастацкім комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна"» праходзіла выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва «Сакавіцкія каты», удзел у ёй прымалі выхаванцы дзіцячых студый, кружкоў, студэнты і выкладчыкі.

http://news.vitebsk.cc/

З **16** па **24 сакавіка** ў выставачнай зале «Духаўскі круглік» працавала выстаўка «Памятники русского зодчества», прадстаўленая Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь – Расійскім Цэнтрам навукі і культуры ў Мінску. Выстаўка адбылася ў рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 1150-годдзю зараджэння расійскай дзяржаўнасці, і складалася з фотавыяў гравюр з прыватнага збору вядомага расійскага калекцыянера станковай і кніжнай графікі, бібліяфіла *Уладзіміра Гур'евіча Белікава*. У адкрыцці экспазіцыі прынялі ўдзел архітэктар-рэстаўратар *Аляксандр Міхайлюк* і старшыня дыяцэзіяльнай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне культуры *протаіерэй Мікалай Прус*.

http://www.gck.by/2013/03/«памятники-русского-зодчества»

«Косорбан» – так назваў сваю выстаўку жывапісу, графікі, арт-аб'ектаў навучэнец аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа *Кірыл Дземчаў*. Вернісаж адбыўся **19 сакавіка** ў Музычнай гасцёўні.

У Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі ў сакавіку адкрылася выстаўка акварэльных работ «Березино. Милый сердцу уголок» мастачкі з г. Санкт-Пецярбурга *Марыны Голікавай*.

http://haradok.museum.by/be

29 сакавіка арт-праект Zabor пачаўся ў Віцебску. Выстаўка рэпрадукцый карцін сучасных беларускіх мастакоў, арганізаваная інвестыцыйнай кампаніяй «Зубр капітал» пры падтрымцы Міністэрства

Антонавічу за кнігу «Шлях да Бога»; у намінацыі «Паэзія» – *Красновай-Гусачэнка Тамары Іванаўне* за кнігу «У света тени нет»; у намінацыі «Літаратура для дзяцей» – *Галіне і Сяргею Трафімавым* за кнігі «Букварь Оршанский», «В мире зеленых чудес», «Они не должны исчезнуть», «Яичные загадки и разгадки», «Почемучкам о слезинках», «Отчего небо голубое, а море синее?», «Оранжевое диво».

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

9 сакавіка ў г. Пскове (Расія) адбыўся акустычны канцэрт «Часам усім хочацца цеплыні», удзел у якім прыняў полацкі рок-гурт «Горад N». Праграма палачан складалася з рускамоўных і беларускамоўных песень. Музыканты атрымалі ад арганізатараў, Пскоўскага рок-клуба, запрашэнне выступіць з паўнавартаснай электрычнай праграмай.

Полацкі веснік. – 2013. – 12 сак. – С. 6.

17 сакавіка народны фальклорны калектыў «Язынка» Язненскага СДК з творчай праграмай прымаў удзел у народным традыцыйным свяце «Масленіца-2013», якое праводзілася ў г. Рэзэкне (Латвія).

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

З чарговай перамогай (лаўрэаты трэцяй прэміі) вярнулася з г. Таліна (Эстонія) каманда малодшай групы студыі «Вобраз» Верхнядзвінскага Дома культуры пад кіраўніцтвам *Т. Сыраватнікавай*. **23–24 сакавіка** праходзіў Міжнародны фестываль-конкурс тэатраў, школ, студый дзіцячай і маладзёжнай моды «MAX MODA 2013», у рамках якога паказалі свае работы і пачынаючыя мастакі-мадэльеры з Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі.

http://www.d-p.by/2013/03/obraz-pobedil-v-tallinne/

27 сакавіка самадзейныя паэты Лёзненскага раёна прынялі ўдзел у міжнародным паэтычным конкурсе «Руднянские зори». Мерапрыемства было арганізавана літаратурным аб'яднаннем «Современник» і раённай бібліятэкай г. Рудня Смаленскай вобласці. Конкурс праводзіўся сярод удзельнікаў літаратурных аб'яднанняў Руднянскага, Веліжскага,

Дзямідаўскага раёнаў Смаленскай вобласці і Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці.

Народны тэатр фальклору «Цярэшка» прадставіў у **сакавіку** калектывы мастацкай самадзейнасці Беларусі на Усерасійскай Масленіцы, якая штогод ладзіцца ў Пскове і доўжыцца цэлы тыдзень. Глыбоцкі калектыў быў адзіным прадстаўніком сярод калектываў мастацкай самадзейнасці Беларусі. «Цярэшкаўцы» прывезлі з сабой падзяку «За выдатнае выступленне ў Ізборску» і дыплом «За захаванне і адраджэнне народных традыцый, актыўны ўдзел у мерапрыемствах Усерасійскай Масленіцы ў старажытным Пскове».

http://vg-gazeta.by/index.php/%D0%9A%D1%83%D0%BB%D1

АГРАЭКАТУРЫЗМ

21 сакавіка адбыўся семінар для гаспадароў аграсядзіб Міёрскага раёна па тэме «Сучасныя формы і сродкі развіцця і ўдасканалення аграэкатурызму». На ім галоўны спецыяліст аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму *Л. А. Вішнеўская* падвяла вынікі работы ў 2012 годзе, вызначыла задачы на 2013 год.

http://mijory.by/main/

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

У Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці створана творчая майстэрня рэжысёраў масавых святаў з вобласці. Пры падтрымцы Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры **11–15 сакавіка** ў АМЦНТ прайшлі абласныя курсы для арганізатараў культурна-дасугавай дзейнасці, рэжысёраў народных свят і абрадаў. Слухачы сустрэліся з вядучымі рэжысёрамі г. Віцебска *М. Г. Раманоўскай*, *І. В. Коўленай*,

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі ў супрацоўніцтве з маршалкоўскім урадам Падляшскага ваяводства прадстаўлена фотавыстаўка вядомага польскага фотамастака *Томаша Тамашэўскага* «Гарантуецца атмасфера добразычлівасці. Падляшша». На выстаўцы можна пабачыць серыю каляровых фотаздымкаў, прысвечаных побыту, працы і рэлігійна-абрадавым аспектам жыцця насельніцтва Падляшша.

http://www.pressdisplay.com/pressdisplay/ru/viewer.aspx

Персанальная выстаўка работ маладога віцебскага жывапісца *Вячаслава Шайнурава* «Диалог» адкрылася ў Мастацкім музеі абласнога цэнтра.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 16 сак. – С. 8.

39 карцін мастачкі *Галіны Загурскай* (жывапіс) былі прадстаўлены на выстаўцы «Трапяткія імгненні», якая адбылася ў Полацкім гарадскім Доме культуры.

Народнае слова. – 2013. – 16 сак. – С. 7.

У Мастацкі музеі экспанавалася выстаўка акварэлі *Фелікса Гумена* «Аромат цветочной радуги».

Витебский проспект. – 2013. – 14 марта. – С. 19

Ацаніць «Автограф на песке» ад *Мікалая Дундзіна* прапаноўваў у **сакавіку** Мастацкі музей. У экспазіцыі былі прадстаўлены амаль шэсць дзясяткаў жывапісных работ, а таксама экслібрысы, скульптуры і арт-аб'екты, створаныя майстрам за два апошнія гады.

Творчае аб'яднанне M'ART прадставіла ў музеі «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» выстаўку жывапісу, графікі, скульптуры і фатаграфіі «Muza». Удзельнікамі праекта сталі *Алег Захарэвіч*, *Уладзімір Канцадайлаў*, *Сяргей Сотнікаў*, *Віктар Шылко*, *Алена Гурына*, *Лілія Кулянёнак*, *Алег Кастагрыз*, *Сяргей Грыневіч*, *Юрый Якавенка.*

Витебский проспект. – 2013. – 21 марта. – С. 19.

14 сакавіка ў абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка работ заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, члена Беларускага саюза

14 сакавіка ў Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага адбылася літаратурна-музычная сустрэча «І тады закахалася хмара...», прысвечаная творчасці У. Караткевіча. Перад прысутнымі выступілі госці з Мінска – удзельнікі этнаграфічнага таварыства. Капэла «На таку» прадставіла ф'южн з фальклорных кампазіцый і песень на вершы пісьменніка. Удзельнікі мерапрыемства таксама мелі магчымасць паслухаць старадаўнюю інструментальную музыку.

Полацкі веснік. – 2013. – 19 сак. – С. 2.

20 сакавіка ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшоў абласны семінар дырэктараў, захавальнікаў фондаў музеяў па праблемах фондавай работы.

Віцебскі АМЦНТ

У Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка працавала выстаўка калекцыі лялек і цацак *Марыны Беляковай* (г. Санкт-Пецярбург) «Мир игрушек».

http://book.polotsk.museum.by/node/33368

МАСТАЦТВА

Упершыню ў Віцебску на сцэне КЗ «Віцебск» **11 сакавіка** выступіў легендарны Нацыянальны балет Грузіі «Сухішвілі».

Витебский проспект. – 2013. – 14 марта. – С. 6.

Канцэрт «Шалом алейхем!», или «Мир вам!» яўрэйскага нацыянальнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Витебские девчата» прайшоў **16 сакавіка** ў ЦК «Віцебск».

http://www.gck.by/wp-content/uploads/2013/03/шалом-алейхем

30 сакавіка ў Полацкім гарадскім Палацы культуры адбыўся рок-канцэрт пад назвай «Вясновы РОК-настрой». Яго арганізатарамі выступілі аддзел культуры Полацкага гарвыканкама і рок-клуб «LIVE in ROCK». Удзел у імпрэзе прынялі гурты з г. Полацка і г. Наваполацка.

Полацкі веснік. – 2013. – 22 сак. – С. 15.

І. В. Баярынцавым, а таксама з выкладчыкамі Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў.

Віцебскі АМЦНТ

24 сакавіка творчыя калектывы Лепельшчыны падцвярджалі званне «народных» і «ўзорных». З гэтай нагоды ў раённым Доме культуры адбыўся канцэрт юных ўдзельнікаў узорнага духавога аркестра Бароўскай дзіцячай школы мастацтваў, адкрыццё выставы выхаванцаў узорнай студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Я хачу намаляваць…». Парадавалі сваім выступленнем гледачоў удзельнікі народнага клуба «Ветэран» з праграмай «Ад усёй душы вам дорым радасць», самадзейныя артысты народнага фальклорнага клуба «Кругаверць» з праграмай «Клуб запрашае сяброў». У малой зале раённага Дома культуры прайшло свята паэзіі і музыкі «Пявучыя струны душы» з удзелам творцаў народнага літаратурна-музычнага клуба «Выток». Свае сюрпрызы падрыхтавалі артысты народнага ансамбля жартоўнай песні «Грымзолі», удзельнікі ўзорных ансамбляў танца «Лілея», «Зачаравашкі», ансамбля танца «Затея», юныя вакалісты народнай эстраднай студыі «Святлана» і інш. Выдатны настрой гасцям падарыла выступленне артыстаў тэатра мініяцюр Поўсвіжскага СДК «Кактус как туз» і г. д.

http://www.lepel-kraj.by/?p=3467#more-3467

27–28 сакавіка ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшоў абласны семінар метадыстаў РАМЦ па вакальна-харавым жанры, кіраўнікоў сельскіх вакальна-харавых калектываў вобласці на тэму «Падбор рэпертуару для дзіцячых вакальна-харавых калектываў. Дзіцячыя і маладзёжныя музычныя праекты». 37 спецыялістаў праслухалі лекцыі па тэмах: «Арганізацыя і ўлік працы аматарскіх калектываў вобласці. Запаўненне і вядзенне дакументацыі. Зліццё жанраў у дзіцячай аматарскай творчасці». Наведалі практычныя заняткі ўзорнага хору дзіцячай школы № 1 г. Віцебска, узорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля

«Перапёлачка» гімназіі № 3 імя А. С. Пушкіна, узорнага харавога калектыву «Дзвіна» Віцебскага абласнога Палаца дзяцей і моладзі.

Віцебскі АМЦНТ

25 гадоў споўнілася ў **сакавіку** народнаму ансамблю народнай музыкі і песні «Крынічанька» Палаца культуры г. Барані.

http://express.skif.by/index.php/stati/kultura

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Абласное свята сямейнай творчасці інвалідаў «Глядзі на мяне як на роўню» сабрала **1 сакавіка** ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна"» 20 сем'яў Прыдзвіння (пераможцы раённых конкурсаў). Арганізатары праекта – упраўленне культуры аблвыканкама, абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, абласны савет жанчын і камітэт па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва. Удзельнікі мерапрыемства пелі, чыталі вершы, дэманстравалі свае творчыя работы і дзяліліся фірменнымі рэцэптамі.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 16 сак. – С. 4.

XIX Міжнародны фестываль яўрэйскіх маладзёжных клубаў «Пуримшпиль в Витебске» прайшоў **8–10 сакавіка**. Свае выступленні паказалі каманды з Расіі, Украіны, Беларусі, а таксама Ізраіля.

Витебский проспект. – 2013. – 14 марта. – С. 4.

12–14 сакавіка ў Оршы адбыўся **фінал абласнога конкурсу маладых выканаўцаў патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў»**, які аб'яднаў на адной сцэне 23 удзельнікі ва ўзросце 16–31 год (18 салістаў і 5 вакальных калектываў) з Віцебска, Оршы, Полацка, Наваполацка, Докшыцкага, Глыбоцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Чашніцкага, Шумілінскага, Бешанковіцкага, Аршанскага і Полацкага раёнаў. Гран-пры конкурсу адзінагалосна аддалі *Лявону Кехваяну* з г. Наваполацка за пранікнёнае і таленавітае выкананне песень «Эх, дороги» и «Go down, Moses» (з рэпертуару Луі Армстранга). У намінацыі «Салісты» першае месца падзялілі *Мікалай Расянок* з г. Віцебска і *Зміцер*

У рамках Тыдзеня дзіцячай і юнацкай кнігі былі праведзены тэатралізванае прадстаўленне «Улыбнулись книжки, к ним пришли детишки» *(Іёдская сельская бібліятэка)*, літаратурна-музычная кампазіцыя «І прыходзіць свята кнігі» *(Вялікасельская сельская бібліятэка)*, пазнавальная гадзіна «Чудесный мир воды» *(Малонкаўская сельская бібліятэка)* і інш.

Выхаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра запрасілі на свята кнігі «Книжное царство – мудрое государство» і літаратурны марафон «Сказочный остров С. Михалкова» *(дзіцячая бібліятэка)*.

Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк

12 сакавіка Літаратурны вечар «Весёлый день с Сергеем Михалковым» да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменіка *(Дабейская сельская бібліятэка)*.

24 сакавіка Тэатралізаванае прадстаўленне «Книга – мой спутник, мой друг» *(Светласельская сельская бібліятэка)*.

28 сакавіка творчая сустрэча з Ганаровым членам Саюза пісьменнікаў Беларусі *Б. П. Беляжэнкам* «И вспомнила заветное душа» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

Выстаўка «История военного мундира» ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова знаёміла наведвальнікаў з форменным адзеннем і амуніцыяй байцоў Чырвонай Арміі ў 1936–1945 гг., а таксама абмундзіраваннем маракоў.

У Музеі беларускага кнігадрукавання пачала працаваць новая выстаўка – «Як жыць, дык жыць для Беларусі...». Экспазіцыя прымеркавана да Міжнароднага дня роднай мовы і прысвечана 130-годдзю з дня нараджэння Вацлава Ластоўскага, Язэпа Лёсіка і Сцяпана Некрашэвіча, а таксама 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага.

http://sophia.polotsk.museum.by/node/33217

Талачынская раённая сетка публічных бібліятэк

Усе бібліятэкі раёна прынялі ўдзел у правядзенні Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Адбыўся лялечны спектакль «Каша из топора» *(гарадская дзіцячая бібліятэка)*, круглы стол «Любимые книги читая, профессию мы выбираем», арганізавана свята кнігі і чытача «Весёлый день с Сергеем Михалковым» *(Коханаўская гарпасялковая бібліятэка)*, конкурсная праграма «Праздник вкусной книги» *(сельская бібліятэка аграгарадка Райцы)* і інш.

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

5 сакавіка Літаратурна-музычная феерыя «Женщина. Цветы. Весна» *(цэнтральная раённая бібліятэка імя Е. Лось)*.

Тэатралізаваная пастаноўка «Кошка мышцы не сястрыца», прысвечаная Сусветнаму дню кошак *(Вялікадолецкая сельская бібліятэка*).

Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк

Супрацоўнікі *Новалукомльскай гарадской бібліятэкі* арганізавалі для сваіх чытачоў выстаўку-ракурс «Непазбежнасць сіняй вышыні», прапанаваўшы падрабязней даведацца пра пісьменнікаў-землякоў, юбіляраў 2013 года А. Шашкова, Г. Пашкова, Р. Рэлеса. Літаратурна-паэтычны ваяж «Чакаю светлыя гадзіны» быў прымеркаваны да 65-годдзя з дня нараджэння паэта-земляка Г. Пашкова. Творчасць землякоў Я. Журбы, Р. Рэлеса аб'яднаў паэтычны кірмаш «Іскры – госці нябёсныя».

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

20 сакавіка Дзень праваслаўнай кнігі, у праграме якога сустрэча з настаяцелем Свята-Успенскай царквы *айцом Васіліем (Стрыжнёвым)*, літаратурнае падарожжа з духоўнымі кнігамі «Біблія» і «Месяцеслов», прэзентацыя кніжнай выстаўкі «Современный мир православия» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*

Лагун з Полацкага раёна. Лаўрэаты другой прэміі таксама два выканаўцы – *Андрэй Чабан* (Докшыцкі раён) і *Мікалай Камянкоў* (г. Наваполацк). Трэцім стаў *Віталь Хаданёнак* (г. Полацк). Сярод вакальных калектываў лепшым прызнаны дуэт *Андрэй Чабан* і *Андрэй Воранаў* (Докшыцкі раён). На другім месцы квартэт народнай студыі эстрадных спеваў «Крэатыў» (г. Орша), на трэцім – дуэт *Аляксандра Падвіцельскага* і *Кацярыны Мацулевіч* з Расонскага раёна.

Віцебскі АМЦНТ

http://nspaper.by/2013/03/20/pesni-yunactva-nashyx-backo-guchali-orshy.html

16–17 сакавіка ў абласной філармоніі прайшоў **Міжнародны трайбл-фестываль «Moon Sensation»**, удзел у ім прынялі танцоры з Беларусі, Расіі і Украіны.

http://news.vitebsk.cc/2013/03/18/mezhdunarodnyiy-traybl-festival-moon-sensation-soeo/

Абласны агляд-конкурс маладзёжных аматарскіх тэатраў сельскіх устаноў культуры **«Тэатральныя далягляды вёскі»**.

Першая зона абласнога агляду-конкурсу праходзіла **22–23 сакавіка** ў ДК аграгарадка Падсвілле. У конкурсе прынялі ўдзел 18 калектываў з 10 раёнаў вобласці: Глыбоцкага, Докшыцкага, Ушацкага, Расонскага, Шаркаўшчынскага, Міёрскага, Браслаўскага, Пастаўскага, Полацкага, Лепельскага.

Пераможцы:

У намінацыі **«Драматычны спектакль»**:

I месца – драматычны калектыў «Сваякі» Камайскага СДК Пастаўскага раёна *(кіраўнік Галіна Уладзіміраўна Бразюль)*,

II месца – дарослы тэатральны калектыў Паташнянскага СК Міёрскага раёна *(кіраўнік Валерый Іванавіч Блажэвіч)*,

III месца – драматычны калектыў «Маскі» Відзаўскага ГпДК Браслаўскага раёна *(кіраўнік Вольга Данатаўна Алейдзан)*.

У намінацыі **«Малыя тэатральныя формы»**:

I месца – узорны тэатральны калектыў Падсвільскага ДК

Глыбоцкага раёна *(кіраўнік Спяцанава Тамара Уладзіміраўна)*,

II месца – тэатр мініяцюр «Трын-трава» Стайскага СДК і тэатр мініяцюр «Самазванцы» Каменскага СДК Лепельскага раёна *(рэжысёр Вольга Уладзіміраўна Шкіранда)*,

III месца – народны тэатр мініяцюр «Ідучыя на смех» Падсвільскага ДК Глыбоцкага раёна *(кіраўнік Тамара Уладзіміраўна Спяцанава)*.

У выставе **«Смачны панадворак»**:

I месца – клуб аматараў беларускай нацыянальнай кухні «Кумкі» Гатаўшчынскага СДК Глыбоцкага раёна *(кіраўнік Таццяна Аляксееўна Будрэвіч)*,

II месца – клуб стараверскай кухні, гульні і абрадаў «Талака» Кубелеўшчынскага СК Шаркаўшчынскага раёна *(кіраўнік Людміла Анатольеўна Ананіч)*,

III месца – народны жаночы клуб «Юнчанка» Юнькаўскага СДК Пастаўскага раёна.

Другая зона абласнога агляду-конкурсу праходзіла **29–30 сакавіка** ў Лёзненскім раённым Доме культуры. У конкурсе прынялі ўдзел 16 калектываў з 9 раёнаў вобласці: Лёзненскага, Шаркаўшчынскага, Шумілінскага, Лепельскага, Бешанковіцкага, Чашніцкага, Віцебскага, Сенненскага, Гарадоцкага.

Пераможцы:

У намінацыі **«Драматычны спектакль»**:

I месца – народны драматычны тэатр Багушэўскага ГпДК Сенненскага раёна *(кіраўнік Юрый Генадзьевіч Іваноўскі)*,

II месца не прысуджалася,

III месца – аматарскі народны тэатр «Вытокі» ДК аграгарадка Веляшковічы Лёзненскага раёна *(кіраўнік Сцяпан Пятровіч Мехаў)*, драматычны гурток «Классік» Радзюкоўскага СДК Шаркаўшчынскага раёна *(кіраўнік Таццяна Фёдараўна Лаздоўская)*.

У намінацыі **«Малыя тэатральныя формы»:**

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

7 сакавіка Вечарына «Восславим женщину», прысвечаная Дню жанчын. Удзел у мерапрыемстве прыняла паэтэса, мастак, рэдактар літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» *Галіна Пятроўна Загурская*.

17 сакавіка Фальклорнае свята «Масленіца» з удзелам фальклорнага калектыву «Родныя напевы» *(Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб)*.

Расонская раённая сетка публічных бібліятэк

У **сакавіку** ў бібліятэках сістэмы адбылася літаратурная вандроўка «Чалавек, які прыдумаў дзядзю Сцёпу» *(Заборская сельская бібліятэка)*, гутарка з настаяцелем мясцовага храма «Першыя крокі ў праваслаўным храме» *(дзіцячая бібліятэка)* і інш.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

З **20** па **31 сакавіка** Тыдзень дзіцячай кнігі, у рамках якога быў паказаны спектакль народнага лялечнага тэатра «Пятрушка» «Чудесная страна Библиотека» *(Сенненская дзіцячая бібліятэка)*, падведзены вынікі выстаўкі малюнкаў «Мой любімы казачны герой» *(Багушэўская гарпасялковая бібліятэка),* арганізавана свята «Кніг запаветныя старонкі» *(Машканская сельская бібліятэка)*, тэатралізаваны літаратурны конкурс «Знайка + Незнайка» *(Ходцаўская сельская бібліятэка)*.

З **18** па **23 сакавіка** Акцыя «Лад жыцця – толькі здаровы!», у рамках мерапрыемства адбылася сустрэча з урачом-нарколагам «У будучае без шкодных звычак» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

23 сакавіка супрацоўнікі *ЦРБ* і *дзіцячай бібліятэкі* прынялі актыўны ўдзел у правядзенні раённага свята «Зиму провожаем, весну встречаем!». Бібліятэкары адказвалі за арганізацыю гульнёвай праграмы і выстаўку-конкурс «Ах, бліночкі-бліны!».

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

14 сакавіка Вечар-дыялог «Праз праваслаўную кнігу да духоўнасці» (да Дня праваслаўнай кнігі). Гасцямі мерапрыемства сталі благачынны цэркваў па Міёрскаім раёне *пратаірэй Віктар Вабішчэвіч*, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 3 г. Міёры *Вольга Мікалаеўна Федуковіч*, настаўніца нядзельнай школы *Таццяна Міхайлаўна Пацеенак (цэнтральная раённая бібліятэка)*.

З **25** па **31 сакавіка** ў бібліятэках раёна адзначалі Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Падчас Тыдня ў *дзіцячай бібліятэцы* адбыліся наступныя мерпрыемствы: экалагічнае падарожжа «Таямніцы дзеда Прыродаведа», урок міласэрнасці «Давайце вучыцца дабрыні», літаратурная гасцёўня «Вясенняя раніца» з удзелам юных мастакоў, літаратурныя замалёўкі «У гасцях у дзядзі Сцёпы» (да 100-годдзя С. Міхалкова), сустрэча з майстрамі народных промыслаў «Спадчына, якую трэба ратаваць» і інш.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

Да Дня паэзіі ў *Хацілаўскай сельскай бібліятэцы* адбылася паэтычная гадзіна «З каханнем нам не пазбегнуць спаткання», у *Варапаеўскай гарпасялковай бібліятэцы* дзейнічала разгорнутая кніжная выстаўка «У паэтычным сузор'і талентаў», у *Парыжскай сельскай бібліятэцы* – тэматычная паліца «Эта обыкновенная, необыкновенная классика».

Да Дня праваслаўнай кнігі ў *дзіцячай бібліятэцы* праведзены вусны часопіс «Земные ангелы и небесные люди», у *ЦРБ* – прэзентацыя кніжнай выстаўкі «Беларусь православная», у *Пастаўскай гарадской бібліятэцы* прайшоў урок духоўнасці «Святыни родного края», у *Юнькаўскай сельскай бібліятэцы* – вечарына духоўнай паэзіі «Хочу с тобой я поделиться».

I месца – драматычны калектыў «Маска» Кіраўскага СДК Віцебскага раёна *(кіраўнік Сняжана Рыгораўна Драчэніна)*,

II месца – гурток мастацкага чытання Астровенскага ДК Бешанковіцкага раёна *(кіраўнік Наталля Васільеўна Крылова)*,

III месца не прысуджалася.

У выставе **«Смачны панадворак»**:

I месца – клуб нацыянальнай кухні «Стайскія прысмакі» Стайскага СДК Лепельскага раёна *(кіраўнік Марына Віктараўна Колас)*,

II месца не прысуджалася,

III месца – клуб нацыянальнай кухні, фальклору і гульні «Бараболя» Вярхоўскага ДК Бешанковіцкага раёна *(кіраўнік Жанна Валер'еўна Бурак*).

«За ўдзел у выставе "Смачны панадворак"» адзначаны народны клуб аматараў беларускай нацыянальнай кухні «Смак» Празямлянскага СК Чашніцкага раёна, клуб нацыянальнай кухні «Прыдзвінскі панадворак» Віцебскага РМЦ, клуб беларускай кухні «Ройніца» Даўгапольскага СДК Гарадоцкага раёна, аматарскае аб'яднанне «Згода» Першамайскага СК Лёзненскага раёна, Яськаўшчынскі Дом фальклору Лёзненскага раёна, клуб беларускай нацыянальнай кухні, беларускай гульні і свят «Хадчаначка» Ходцаўскага СДК Сенненскага раёна.

Віцебскі АМЦНТ

30 сакавіка ў г. Віцебску ў межах парафестывалю аматарскай творчасці інвалідаў адбылося рэгіянальнае **свята жэставай песні «Поющие руки»**. У свяце прынялі ўдзел 21 чалавек з парушэннем слыху. У канцэртнай праграме ўдзельнікі выступілі ў намінацыях «Індывідуальныя выканаўцы», «Дуэты», «Трыа», «Ансамблі». Арганізатар – ДУ «Віцебскі АМЦНТ».

Віцебскі АМЦНТ

З **24** па **31 сакавіка** ў Палацы культуры «Полацк-Шкловалакно» праходзіў **фестываль праваслаўнай культуры «Кладезь»** з духоўна-

асветніцкай праграмай. У рамках фестывалю адбыліся выступленні лялечнага тэатра «Батлейка», былі прадстаўлены экспазіцыі «Беларуская хатка», «Евфросиния Полоцкая», скрыпторый і майстар-клас па народных рамёствах.

http://www.pvestnik.by/?p=12699

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

18–22 сакавіка ў абласной бібліятэцы праходзіў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі, у рамках якога адбыўся шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю дзіцячай кнігі і чытання сярод дзяцей і падлеткаў: экскурсіі па бібліятэцы, кніжныя выстаўкі, літаратурныя сустрэчы, гульні, конкурсы, віктарыны. Супрацоўнікамі аддзела дзіцячай літаратуры быў рэалізаваны праект «Любимая книга детства», падчас якога прадстаўнікі розных прафесій знаёмілі школьнікаў са сваімі любімымі кнігамі дзяцінства. Ва ўрачыстым адкрыцці Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі прыняла ўдзел народная артыстка Беларусі *С. А. Акружная*, супрацоўнікі Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі, Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Віцебскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.

20 сакавіка ў бібліятэцы адбылося адкрыццё персанальнай выстаўкі члена Саюза мастакоў Беларусі *Уладзіміра Мікалаевіча Вальнова* «Посвящение матерям».

27 сакавіка адбылося падвядзенне вынікаў гарадскога творчага конкурсу электронных прэзентацый «Тварэнне цэлага жыцця: 205 гадоў трагедыі Гётэ “Фаўст”». Свае работы на конкурс прадставілі больш за 30 удзельнікаў, сярод якіх студэнты і школьнікі г. Віцебска. Прызавыя месцы былі прысуджаны *Валерыі Пашкевіч*, *Іне Цэдрык*, *Анастасіі Шараевай*. Усе ўдзельнікі ўзнагароджаны прызамі, прадастаўленымі партнёрам конкурсу – інстытутам імя Гётэ ў Мінску.

клуба «Гарадзянка», які дзейнічае пры цэнтральнай раённай бібліятэцы *(дзіцячая бібліятэка)*.

29 сакавіка Этнаграфічная экспедыцыя «З крыніц справедвечных» да народнага майстра в. Прудніці *Варвары Аляксееўны Фёдаравай (Прудніцкая сельская бібліятэка)*.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

10 сакавіка Літаратурная гадзіна «Мне наканавана ў песні дагарэць» да 110-годдзя Т. Кляшторнага *(Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза)*.

12 сакавіка Адкрыццё выстаўкі работ навучэнцаў Лепельскай ДШМ «Весенняя капель» у галерэі «Арт-Лепель» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

27 сакавіка Бібліятэчная выстаўка «Песні роднай Беларусі» і канцэрт для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прысвечаны 75-годдзю з дня заснавання Ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

21 сакавіка У рамках адкрыцця Тыдня дзіцячай кнігі адбылося мерапрыемства «Падарожжа ў Чытай-горад» для вучняў 1–4 класаў школ горада *(дзіцячая бібліятэка)*.

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

22 сакавіка Семінар для супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк сістэмы «Библиотека и патриотическое воспитание: поиск эффективных форм деятельности», прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

22 сакавіка Літаратурна-музычная сустрэча «Славим край свой в стихах и песнях» самадзейных паэтаў і кампазітараў Лёзненскага і Руднянскага раёнаў, прымеркаваная да Сусветнага дня паэзіі *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

12 сакавіка Вечарына «Дзе сэрцу цёпла, спеўна будзе» з нагоды 20-годдзя народнага клуба цікавых сустрэч «Сучаснік». Адбыліся прэзентацыі зборнікаў вершаў члена клуба *Ч. Петрашкевіч* «Я – белая чайка», *А. Бубалы* «Паехалі» і «Бяроза над затокай».

19 сакавіка Выстаўка-прагляд літаратуры «Люта-вогненны месяц Асвейшчыны», прымеркаваная да 70-годдзя Асвейскай трагедыі, была арганізаваная супрацоўнікамі *ЦРБ* на раённай канферэнцыі «Диалог поколений».

27 сакавіка Семінар для бібліятэкараў раёна «Библиотека как институт духовно-морального воспитания населения» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

7 сакавіка Інфармацыйная гадзіна «Слава і гонар Віцебшчыны» па матэрыялах часопіса «Алеся» (№ 11, 2012 г.), які быў прысвечаны прадстаўніцам Віцебскай вобласці ў рамках праекта «Жаночы твар Беларусі» *(Бабініцкая сельская бібліятэка)*.

21 сакавіка Дзень прававых ведаў «Сацыяльная ахова інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь». У мерапрыемстве прымалі ўдзел старшыня Віцебскай абласной арганізацыі ГА «БелТІЗ» *К. Ламчаноўскі*, спецыяліст тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна *Н. Казлова* і юрыст-стажор юрыдычнай кансультацыі № 1 г. Віцебска *А. Емяльяненка (цэнтральная раённая бібліятэка)*.

22 сакавіка Адкрыццё выстаўкі работ члена Саюза мастакоў Беларусі *Валерыя Чукіна* «В предгорьях рая…» *(Курынская сельская бібліятэка)*.

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

6 сакавіка Вечар-партрэт «Жанчына – крыніца ўсёй прыгажосці» *(Пальмінская сельская бібліятэка-школа здаровага ладу жыцця)*.

19 сакавіка Творчая сустрэча «Літаратурныя сцяжынкі» з членамі

27–28 сакавіка ў бібліятэцы прайшоў семінар для дырэктараў раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк «Статус і функцыі публічных бібліятэк у сацыякультурных умовах», на якім былі падведзены вынікі дзейнасці за 2012 год і вызначаны асноўныя напрамкі работы на 2013 год. У семінары прынялі ўдзел галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Н. І. Задзяркоўская, галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама *Г. У. Мартынава*, дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКіМ, кандыдат педагагічных навук, прафесар *М. А. Яцэвіч*. У рамках семінара былі праведзены круглыя сталы «Бяспека ў бібліятэцы» і «Сацыяльнае партнёрства бібліятэк: вопыт, тэхналогіі, ацэнка», таксама адбыўся творчы візіт удзельнікаў семінара ў ДУ «Віцебскі абласны цэнтр народнай творчасці».

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

14 сакавіка Сустрэча з расійскім гісторыкам, пісьменнікам, экспертам па гісторыі Расіі і сумежных дзяржаў *Аляксандрам Аляксандравічам Чароміным*, прэзентацыя кнігі «Туровское княжество (X–XIV века)» *(ЦГБ імя М. Горкага)*.

14 сакавіка Творчыя сустрэчы вучняў школ з дзіцячымі пісьменнікамі *Галінай і Сяргеем Трафімавымі (дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака)*.

28 сакавіка Цыкл мерапрыемстваў «Весь день с Максимом Горьким», прысвечаны 145-й гадавіне з дня нараджэння рускага пісьменніка, адбыўся ў *ЦГБ імя М. Горкага*. Былі прадстаўлены кніжныя выстаўкі «Максим Горький: диалог с историей», «Перечитаем Горького», прайшла акцыя «Возьми Горького с собой». З удзелам студэнтаў філалагічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава і старшага выкладчыка *Н. В. Галубовіч* адбыліся Горкаўскія чытанні, прэзентацыя дакументальнага рамана П. Басінскага «Страсти по Максиму. Горький: 9

дней после смерти» і прагляд кінафільма Эміля Лацяну «Табор уходит в небо». Супрацоўнікі інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі падрыхтавалі буклеты «Горьковская литературная премия» і «Произведения – лауреаты Горьковской премии».

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

14 сакавіка Адкрыццё выстаўкі графікі, жывапісу і акварэлі «Замалёўкі» мастачкі з г. Наваполацка *Ірыны Сарокінай (цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага)*.

21 сакавіка «Урок аптымізму» для адзінокіх састарэлых людзей з удзелам дырэктара фонду «Крыніца дабра» *Святланы Турчонак*, урача бальніцы сястрынскага догляду УА «НЦГБ» *Анастасіі Брылёвай,* загадчыцы аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі НТЦСАН *Ірыны Дзмітрыевай* і старшыні камітэта салдацкіх маці *Іны Протас (бібліятэка імя К. Сіманава)*.

28 сакавіка Гучныя чытанні «Читай, я буду слушать!» у дзіцячай паклініцы *(супрацоўнікі бібліятэкі імя А. Пушкіна).*

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

7 сакавіка Сустрэча з ініцыятарамі дабрачынных праектаў з горада-пабраціма Фрыдрыхсхафена (Германія), аўтарамі кніг пра Полацк *Ротраутам* і *Юрген Біндэр.* У рамках мерапрыемства адбылася прэзентацыя фільма «Знаёмцеся, Фрыдрыхсхафен» *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

14 сакавіка Сустрэча «Свет православной книги» са свяшчэннаслужыцелем Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра *айцом Ігарам (цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

21 сакавіка Літаратурны вечар «Певучие струны души» *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

Аршанская раённая сетка публічных бібліятэк

21 сакавіка Семінар бібліятэкараў раёна, прысвечаны прапагандзе літаратурнай творчасці пісьменнікаў Аршаншчыны. Супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу былі дадзены метадычныя рэкамендацыі па формах і метадах работы, удзельнікі падзяліліся вопытам работы па гэтым накірунку *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Бешанковіцкая раённая сетка публічных бібліятэк

6 сакавіка Конкурсная праграма «Мамы і дочкі», прысвечаная Дню жанчын *(сельская бібліятэка аграгарадка Астроўна)*. Удзел у мерапрыемстве прынялі навучэнцы Астровенскага філіяла школы мастацтваў.

11 сакавіка Літаратурна-музычны вечар «Свечи, музыка и стихи…», прысвечаны Сусветнаму дню паэзіі, у рамках якога прайшоў агляд зборнікаў паэзіі *(Драздоўская сельская бібліятэка)*.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

15 сакавіка Літаратурна-музычная кампазіцыя «Я – грамадзянін Беларусі» *(Іказненская сельская бібліятэка).*

19 сакавіка ў *Браслаўскай ЦБС* прайшла чарговая нарада бібліятэчных работнікаў. На сустрэчу з імі былі запрошаны настаяцель мясцовай царквы Успення Прасвятой Багародзіцы *іерэй Анатоль Іваноў*. Адбылося пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Імёны. Асобы. Лёсы», прысвечанае 95-годдзю з дня нараджэння П. М. Машэрава. Падчас работы «Прафесійнай майстэрні» адбыліся кансультацыі па правядзенні аналізу выкарыстання перыядычных выданняў і аналізу чытання асобных груп карыстальнікаў і інш.

19 сакавіка Вечар-партрэт «Пра Нарбута моўлю я слова» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

28 сакавіка Тэматычная гутарка «Моладзь і здароўе» з удзелам фельчара ФАПа *(Карасінская сельская бібліятэка)*.